УДК 811.161.3

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ “СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА” ДЛЯ СТУДЭНТАЎ 1 КУРСА СПЕЦЫЯЛБНАСЦІ “РАМАНА-ГЕРМАНСКАЯ ФІЛАЛОГІЯ”

**А. В. Доўгаль**
(Установа адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”,
кафедра тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі)

*У артыкуле вызначаны мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны “Сучасная беларуская мова”, апісана вучэбна-метадычнае забеспячэнне выкладання дысцыпліны для студэнтаў 1 курса спецыяльнасці “Рамана-германская філалогія”.*

Згодна з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі, тыпавым вучэбным планам і вучэбным планам па спецыяльнасці 1-21 05 06 Рамана-германская філалогія дысцыпліна “Сучасная беларуская мова” адносіцца да дысцыплін агульнапрафесійнага модуля кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі. Яна вывучаецца студэнтамі дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі на працягу двух семестраў на 1 курсе навучання. На засваенне дысцыпліны прадугледжана 198 гадзін, з іх 94 аўдыторныя (40 гадзін лекцый і 54 гадзіны практычных заняткаў). Формамі бягучага кантролю ведаў з’яўляюцца залік у 1 семестры і экзамен у 2 семестры.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дысцыпліна “Сучасная беларуская мова” з’яўляецца важным кампанентам агульнай філалагічнай адукацыі студэнтаў, паколькі дапамагае засвоіць нацыянальную спадчыну беларускага народа шляхам вывучэння яго мовы, выступае ўмовай фарміравання высокай культуры маўленчых зносінаў. Мэта курса заключаецца ў фарміраванні прафесійнай лінгвістычнай кампетэнцыі, неабходнай для рашэння задач у сферы прафесійнай дзейнасці выкладчыка (перакладчыка) пры ажыццяўленні вуснай і пісьмовай камунікацыі на беларускай мове, перакладзе з рускай мовы на беларускую і наадварот. Дасягненне мэты забяспечваецца праз вырашэнне наступных задач:

– фарміраваць цэласнае ўяўленне аб беларускай мове ў структурна-семантычным і функцыянальна-камунікатыўным аспектах;
– паглыбіць веды аб адметных заканамернасцях беларускай мовы на розных моўных узроўнях;
– удасканальваць узровень валодання літаратурнымі нормамі сучаснай беларускай мовы;
– выпрацоўваць навыкі камунікацыі на беларускай мове ў прафесійнай дзейнасці;
– усведамляць асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай беларускай мовы;
– выхоўваць павагу да духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа.

Вывучэнне дысцыпліны скіравана на фарміраванне ў студэнтаў як базавых і ўніверсальных кампетэнцый, так і наступнай спецыялізаванай кампетэнцыі: валодаць вуснай і пісьмовай разнавіднасцямі беларускай літаратурнай мовы; карыстацца асноўнымі паняццямі і тэрмінамі ў іх сістэмна-структурных сувязях.

Важным складнікам паспяховага фарміравання прадметных кампетэнцый у студэнтаў з’яўляецца вучэбна-метадычнае забеспячэнне выкладання дысцыпліны. Пад вучэбна-метадычным забеспячэннем (ВМЗ) разумеецца сукупнасць вучэбна-метадычных сродкаў, якія садзейнічаюць выніковаму засваенню студэнтамі зместу вучэбнай праграмы вышэйшай адукацыі. ВМЗ з’яўляецца галоўным інструментам арганізацыі вучэбнага працэсу, які непасрэдна адлюстроўвае як логіку пабудовы вучэбнай дысцыпліны, так і неабходны для засваення аб’ём вучэбнага матэрыялу.

Практыка сведчыць, што стварэнне аптымальнага і ўніверсальнага ВМЗ выкладання пэўнай дысцыпліны ў вышэйшай школе з’яўляецца складанай задачай, што абумоўлена не толькі рознымі падыходамі да разумення напаўнення паняцця “вучэбна-метадычнае забеспячэнне”, але і розным узроўнем падрыхтоўкі і кваліфікацыі педагагічных кадраў, матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі і інш. Аднак бясспрэчнай застаецца мэта распрацоўкі ВМЗ – павышэнне якасці арганізацыі вучэбнага працэсу. На нашу думку, стварэнне ВМЗ садзейнічае асэнсаванню выкладчыкам уласнай педагагічнай дзейнасці і імкненню павышаць свой узровень педагагічнага майстэрства.

ВМЗ выкладання дысцыпліны “Сучасная беларуская мова” для студэнтаў 1 курса спецыяльнасці “Раман-германская філалогія” ва ўстанове адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова” ўключае наступныя кампаненты:

1) вучэбная праграма;
2) вучэбныя дапаможнікі;
3) вучэбна-метадычны комплекс (ВМК);
4) вучэбна-метадычныя матэрыялы, змешчаныя ў віртуальна-адукацыйнай прасторы Moodle;
5) матэрыялы для бягучага кантролю ведаў.

У вучэбнай праграме па дысцыпліне сфармуляваны мэта і задачы курса, патрабаванні да ўзроўню засваення ведаў, адзначана месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязь з іншымі вучэбнымі курсамі, пададзена колькасць гадзін на вывучэнне дысцыпліны, размеркаванне вучэбных гадзін па семестрах і відах заняткаў, прыведзены пералік тэм, распісаны іх змест з улікам сучаснага стану развіцця беларускай мовы, змешчаны спіс вучэбнай літаратуры, пералікі заданняў да кіруемай самастойнай работы студэнтаў, адзначаны сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці.

На сённяшні дзень дысцыпліна “Сучасная беларуская мова” адносіцца да вучэбных дысцыплін, забяспечаных вучэбнымі выданнямі ў поўным аб’ёме (перадусім, гэта падручнікі, выдадзеныя ў Беларускім дзяржаўным універсітэце і Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка). Бібліятэка ўніверсітэта мае дастатковую колькасць вучэбных дапаможнікаў, змест якіх дазваляе засвоіць вучэбную дысцыпліну на належным узроўні. Спісы рэкамендаваных вучэбных і даведачных дапаможнікаў змешчаны ў вучэбнай праграме.

ВМК па дысцыпліне “Сучасная беларуская мова” з’яўляецца галоўным дыдактычным сродкам навучання. Гэта аўтарскі вучэбна-метадычны прадукт, у які ўключана ўся неабходная інфармацыя для праходжання дысцыпліны: тэарэтычныя матэрыялы для лекцыйных заняткаў, вучэбныя матэрыялы для правядзення практычных заняткаў, пытанні і заданні да заліку і экзамену, заданні для правядзення кантралюемай самастойнай работы і формы праверкі ведаў, пералік вучэбных дапаможнікаў і інфармацыйна-даведачных выданняў (лінгвістычных слоўнікаў і даведнікаў) для падрыхтоўкі да заняткаў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі (ІКТ) сталі неад’емным складнікам сучаснай адукацыі, актыўна прымяняюццца для ўзаемадзеяння выкладчыка і студэнта ў працэсе як анлайн-, так і афлайн-навучання. У МДУ імя А. А. Куляшова пляцоўкай для рэалізацыі сучасных ІКТ навучання стала модульная сістэма кіравання вучэбным працэсам Moodle. Сістэма прапануе шырокі інструментарый для размяшчэння вучэбных матэрыялаў і далейшага кіравання вучэбным працэсам. Для засваення дысцыпліны “Сучасная беларуская мова” ў Moodle размешчаны наступныя матэрыялы: прэзентацыі да лекцыйных заняткаў, заданні да практычных заняткаў, інтэрактыўныя спасылкі на вучэбныя і даведачныя рэсурсы, заданні да кіруемай самастойнай работы студэнтаў і тэсты для арганізацыі кантролю, пытанні да бягучых форм кантролю. На жаль, у шэрагу інструментаў Moodle (у той версіі, якая прапануецца ў нашым універсітэце) адсутнічае элемент “Відэаканферэнцыя” (BigBlueButton) для арганізацыі анлайн-заняткаў у рэжыме рэальнага часу.

Матэрыялы для бягучага кантролю ведаў прадстаўлены пытаннямі і заданнямі да заліку і экзамену. Яны ўключаны ў ВМК і даступны ўсім студэнтам, падпісаным на вучэбны курс у Moodle.

У бліжэйшай перспектыве плануецца папоўніць ВМЗ рабочым сшыткам і электронным ВМК.

Такім чынам, ВМЗ дысцыпліны “Сучасная беларуская мова” – гэта сістэма сродкаў, якія забяспечваюць эфектыўнае выкладанне і паспяховае кіраванне працэсам засваення вучэбнай дысцыпліны.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова